# Мама прыйшла

Быў зімовы веч**а**р. Мама **яшчэ** не в**я**рнулася з работы. Зоя ч**а**кае яе.

За акном гу**дз**е завіруха. Дзяўч**ы**нка тр**ы**вожна прыслухоўвае**цц**а да завыва**ння** ветру. Ёй здае**цц**а, што за акном страшны звер. Вось ён грукае лапай у ш**ы**бу. Зоя ад страху заплю**шч**ыла воч**ы**.

Вось і мама прыйшла. Яна абняла Зою і пац**а**лавала. За акном ужо не выла завіруха. **Ц**іха шуме**ў** ве**ц**ер. Ён лагодна дакрана**ў**ся да шыбы. Зоя падышла да акна. Над з**я**млёю вес**е**ла круж**ы**ліся белыя сн**я**ж**ы**нкі.



## Падбярыце сінонімы

завіруха
кружыліся
гудзе
не вярнулася
грукае
чакае
абняла
лагодна

выглядае
завывае
не прыйшла
мяцеліца
ляцелі
кружыць
завея
стукае
пяшчотна
прытуліла



## Прыйшла мама

Зімовы веч..р. За акном гу..е завіруха. Мама яшч.. не в..рнулася з работы. Зоя ч..кае яе. Дзя..чынка тр..вожна прыслухоўвае..а да завыва..я ветру.

Ёй здае..а, што за акном страшны звер. Вось ён грукае лапай у ш..бу. Зоя ад страху заплюшч..ла вочы.

Прыйшла мама. Абняла Зою, пац..лавала. За акном ужо не выла завіруха. ..іха шуме.. ве..ер, ён лагодна дакрана..ся да шыбы. Зоя падышла да акна. Над з..млёю весела круж..ліся белыя сн..ж..нкі.

Прыйшла мама

1. Зімовы вечар.
2. Завіруха як страшны звер.
3. Усё змянілася.

гуд..е

яшч.. не вярнулася

тр..вожна пр..слухо..вае..а да завыва..я

грукае ў шыбу

заплюшч..ла

пацалавала

лагодна дакранаўся